# Вітаем дэлегатаў VI партыйнай справаздачна-выбарнай канферэнцыі!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1988
ЧАЦВЕР
20
КАСТРЫЧНІКА

№ 27(1585)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## У наступным нумары чытайце:

— Як справы? — хвалючыся, пыталіся мы ў карэспандэнта Ірыны Дзяргач.— Ці ўсё атрымліваецца?

І чулі ў тэлефоннай трубцы бадзёрае:

— Добра.

Справа ў тым, што на нейкі час (дакладней, адзін дзень), яна вырашыла папрацаваць на месцы намесніка сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце Сяргея Балашэнкі.

Што з гэтага атрымалася? Як ставіцца цяпер Ірына да камсамольскай дзейнасці і папрокаў у адрас камітэта? Каб знайсці адказы на гэтыя пытанні, дастаткова зазірнуць у наступны нумар.

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

●●●

**НЯМАЛА НАРАКАННЯЎ**

можна пачуць у апошні час на стан матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта. Савет Міністраў БССР нават прыняў пастанову «Аб мерапрыемствах па паскоранаму развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы БДУ». Аб ходзе яе выканання і ішла размова на апошнім пасяджэнні рэктарата.

З інфармацыяй аб падрыхтоўцы універсітэта да работы ў зімовых умовах выступіў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы У. І. Тарасевіч.

М. АНДРЭЕЎ.

●●●

**«НЕВЯДОМЫ АДДЗЕЛ»**

— жартуюць з сябе супрацоўнікі аддзела ідэйнага выхавання і масавай работы бібліятэкі БДУ. І сапраўды, чаму тут яшчэ не дастаткова частыя госці студэнты, супрацоўнікі, аспіранты, выкладчыкі? Няўжо няма пытанняў па арганізацыі і правядзенню вечароў, дыскусій, аглядаў? Няўжо не ўзнікае патрэбы ў кансультацыі пры падборы літаратуры для курсавых работ, пры арганізацыі выставак і г. д.? Завітайце сюды і, упэўнена, вы станеце частым наведвальнікам аддзела.

А калі вы не жадаеце заглядваць у аддзел, яго супрацоўнікі ідуць да вас самі. Шкада толькі, што іх вельмі мала, і ахапіць работай усіх ім проста не пад сілу. Тым не менш, гутаркі, агляды, тэматычныя вечары збіраюць усё больш і больш прысутных. Тэматыка іх самая разнастайная. Напрыклад, у мінулым-пачатку гэтага месяца на многіх факультэтах былі праведзены літаратурныя вечары, прысвечаныя творчасці Г. Ахматавай, У. Маякоўскага.

Многіх зацікавілі агляды літаратурных навінак на гістарычныя тэмы і літаратурных часопісаў, а таксама падрыхтаваныя па творчасці Л. М. Талстога («Л. М. Талстой — чалавек і мысліцель»), М. Горкага («Грамадска-палітычная дзейнасць і погляды Горкага») і іншыя.

Вы можаце таксама пазнаёміцца з выстаўкамі, арганізаванымі супрацоўнікамі аддзела масавай работы: «Беларусь — мая Радзіма», «Да 70-годдзя камсамола», «Табе, першакурснік!».

З. МІХНЕВІЧ.

---

ВА ЎМОВАХ пашырэння галоснасці і дэмакратызацыі савецкага грамадства вялікае значэнне мае своечасовае інфармаванне партыйнага камітэта аб праблемах, клопатах, якія хвалююць калектыў, яго асобных членаў. Аператыўнае рэагаванне і ўлік у сваёй дзейнасці інтарэсаў калектыву дазволіць парткому універсітэта працаваць больш эфектыўна, своечасова вырашаць набалелыя пытанні.

**ВЫВУЧАЕМ ГРАМАДСКУЮ ДУМКУ**

## Формы падкажа практыка

З гэтай мэтай пры парткоме створана камісія па вывучэнню грамадскай думкі. Асноўныя напрамкі дзейнасці яе ўключаюць пытанні дэмакратызацыі, развіцця студэнцкага самакіравання, бягучыя справы — падрыхтоўка да сесіі, якасць выкладання, ацэнка дзейнасці грамадскіх арганізацый, пытанні быту, адпачынку і інш.

Жадаючыя падзяліцца сваёй думкай па тых ці іншых пытаннях могуць кожны тыдзень у пятніцу з 10 да 12 гадзін пазваніць па тэлефоне 20-78-23. Пытанні будуць аналізавацца камісіяй і перадавацца для вырашэння ў партыйны камітэт.

Для таго, каб існавала зваротная сувязь, на старонках «Беларускага універсітэта» рэгулярна будзе публікавацца спецыяльны бюлетэнь камісіі, дзе будзе паведамляцца аб прынятых (ці непрынятых) мерах па тых ці іншых пытаннях.

Вялікую дапамогу ў рабоце камісіі могуць аказаць прапагандысты сеткі палітасветы універсітэта, а таксама адказныя за правядзенне адзіных палітдзён на факультэтах. На занятках і палітднях узнімаецца шмат надзённых, вострых пытанняў нашага калектыву, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Акрамя гэтага мы звяртаемся да выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін. Заўважана, што ў студэнтаў ва ўмовах галоснасці вырас інтарэс да грамадскіх праблем, і было б няправільным не ўлічваць гэтага ў рабоце універсітэцкай партыйнай арганізацыі.

Акрамя гэтага на факультэтах можна было б аформіць спецыяльныя стэнды, свайго роду «сацыяльны індыкатар», дзе змяшчаць пытанні і адказы на іх, якія падаюцца пісьмова ў скрынку, што знаходзіцца на гэтым жа стэндзе.

Камісія лічыць, што гэта толькі першыя крокі ў наладжванні вывучэння грамадскай думкі. Мы спадзяёмся, што практычная дзейнасць падкажа новыя формы і метады работы.

У. АРЛОЎ,
член камісіі па вывучэнню грамадскай думкі, выкладчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

---

**ІНТЭРВ'Ю З КАНДЫДАТАМ**

*— Работа XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі закончылася першага ліпеня. Але на гэтым мы не ставім кропку, хутчэй двукроппе. Што змянілася ў жыцці вашай партарганізацыі за тры месяцы, якія прайшлі пасля канферэнцыі?*

**ХУХЛЫНДЗІНА Л. М., выкладчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, кандыдат у члены парткома.**



— XIX партканферэнцыя адкрыла перад партыйнымі арганізацыямі вялікія магчымасці. Ад нас жа залежыць, ці стануць яны рэальнасцю. Але гаварыць сёння аб тым, што ў рабоце партыйнай арганізацыі адбыліся вялікія змены, яшчэ, напэўна, рана. Так, стала больш галоснасці пры вылучэнні кандадатур у састаў парткома, больш зацікаўленая размовы ідзе на партыйных сходах. Але адных слоў мала, бурнымі абмеркаваннямі, мітынгамі і прамовамі ўжо не абысціся. Нам патрэбны практычныя справы. І на адным з галоўных месц павінны стаць праблемы ідэалагічнага забеспячэння перабудовы, выкарыстанне актыўных форм ідэйнага ўздзеяння, дэмакратычных па сутнасці і дзейсных па сваіх канкрэтных выніках.

У сувязі з гэтым хацелася б сказаць аб існуючай структуры партарганізацый. Адрыў камуністаў-грамадазнаўцаў ад партыйных арганізацый факультэтаў перш за ўсё адмоўна ўплывае на стан работы пярвічных партыйных арганізацый кафедраў грамадскіх навук. Мы замыкаемся на адных і тых жа праблемах, узнікае непатрэбны паралелізм у рабоце кафедры і яе партыйнай арганізацыі. Страціўшы сувязь з факультэтамі, некаторыя камуністы адрываюцца і ад канкрэтнай работы. Калі сёння нельга вярнуцца да старой структуры, то неабходна было б падумаць аб удасканаленні новай.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

---

**АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ**

## Да партыйнай канферэнцыі

ПРАЦЯГВАЕЦЦА падрыхтоўка да VI справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі універсітэта. Прайшлі сходы ў партыйных арганізацыях факультэтаў і падраздзяленняў, на якіх вылучаны кандыдатуры ў састаў партыйнага камітэта БДУ. Сярод іх: Часноўскі М. Э. (гістфак); Калупаеў А. А., Маляўка В. В. (СКТБ з доследнай вытворчасцю); Навумовіч У. А., Шамякіна Т. І., Караічава Т. В. (філфак); Ціхіня В. Г., Шумак А. Г., Чыгір В. Ф., Грунтоў А. І., Лысякоў У. М. (юрфак); Бераснева А. І., Нячай А. А. (кафедра палітэканоміі гуманітарных факультэтаў); Пісарэнка І. Я. (кафедра марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму).

---

**УЛАСНАЕ МЕРКАВАННЕ**

# Аб тым, што хвалюе

У размове са мной Мікалай Марчанка, студэнт 4-га курса гістфака, намеснік сакратара партыйнай арганізацыі па рабоце з маладымі камуністамі, заўважыў:

— Я як разумею: камуніст павінен быць прыкладам у любой справе. У грамадскай рабоце, спорце, мастацкай самадзейнасці і, галоўнае, у вучобе. У нас жа, на аддзяленні гісторыі КПСС, у працэнтных адносінах пасляховасць членаў партыі ніжэй. І мяне вельмі хвалюе такое становішча. Якія ж мы камуністы? Які авангард? І як дабіцца, каб сапраўды ім сталі? Ведаю, адным махам гэтага не зробіш.

І сапраўды, чаму так атрымліваецца — прымаюць жа ў партыю лепшых? На гэтае і іншыя пытанні і стараецца знайсці адказ М. Марчанка.

— Але паказушная актыўнасць нам таксама не патрэбна,— нібы спрабуючы пераканаць у гэтым мяне, гаворыць Мікалай.— Галоўнае, зацікавіць людзей, знайсці ім справу па душы. Няўжо не зразумела: толькі ў такім выпадку яна прынясе чакаемы вынік.

Гэтага прытрымліваліся і тады, калі даручалі кандыдату ў члены КПСС Д. Белабродскаму займацца арганізацыяй культурна-масавай работы. Ён праявіў сапраўдны талент, ініцыятыву, вялікія арганізатарскія здольнасці. І калі камуністы заслухоўвалі яго справаздачу аб прыходжанні кандыдацкага стажа (гэта робіцца два разы ў год на партыйным сходзе ці на пасяджэнні партбюро), аднадушна згадзіліся: лепшую кандыдатуру на гэту «пасаду» знайсці цяжка.

І яшчэ адна вельмі важная праблема турбуе Мікалая Марчанку. Зараз ідзе камплектаванне груп для заняткаў у школе маладога камуніста. Раней як было: хочаш ці не, а школу абавязкова павінен скончыць. І амаль нікога не хвалявала: цікава табе там, ёсць якаянебудзь карысць ці марная трата часу, вынесеш штосьці каштоўнае для сябе ці выйдзеш і забудзеш, аб чым гаварылі? Зараз пастараліся паламаць гэту застарэлую, аджыўшую форму арганізацыі заняткаў у школе. Кожны, ідучы на вучобу, мае права выбару. Калі цябе менш цікавяць пытанні эканомікі, больш — сацыяльнай палітыкі, калі ласка, твае пажаданні будуць улічаны: школа маладога камуніста будзе працаваць па некалькіх напрамках.

Раней студэнты часта прапускалі заняткі ў ШМК, спасылаючыся на недахоп часу. Паклапаціліся на гістфаку і аб гэтым і вырашылі даць магчымасць маладым камуністам займацца самастойна. А як жа кантраляваць тых, хто выбраў такую форму? Аказваецца, не так складана, патрэбна толькі ўвесці сістэматычныя субяседаванні з вопытнымі камуністамі. Тут ёсць два станоўчыя моманты. Па-першае, кансультант пераканаецца, ці правільна разумее малады камуніст асноўныя напрамкі той праблемы, якую вывучае. Па-другое, будзе ісці перадача вопыту старэйшага пакалення маладым.

Задумы, безумоўна, добрыя, але ці хопіць сіл і часу, каб ажыццявіць іх. Аб гэтым і клапоцяцца сёння Мікалай Марчанка і маладыя камуністы гістфака.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

# Да партыйнай канферэнцыі

**А якім ён павінен быць, партыйны сход? Якая атмасфера пануе на ім сёння? Пытанняў сабралася многа. І хоць здаюцца яны самымі рознымі, і хоць узнікла кожнае са сваёй нагоды, агульным для іх застаецца тое, што не хаваюць яны беды за частаколам аб'ектыўных прычын.**

**Не ўсё яшчэ ідзе гладка, не ўсё адточана. Але, можа, такое і не патрэбна? Азначае гэта, што не стварaецца за тыдзень да схода сцэнарый, калі кожнаму выступаючаму адведзена свая роля, а кожная прамова напісана пад дыктоўку сакратара.**







Ідзе партыйны сход...

Рэпартаж з філалагічнага факультэта падрыхтаваў С. Плыткевіч.

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА

# На хвалі жыцця

КОЖНЫ факт з яго біяграфіі высвечвае цікавы характар, паказвае шматграннасць асобы вучонага, арганізатара навукі, кіраўніка спецыфічнага падраздзялення універсітэта.

Самае значнае і агульнапрызнанае дасягненне Аляксандра Фёдаравіча Чарняўскага — гэта ўмацаванне і росквіт навукова-даследчага інстытута, які ён узначальвае з 1979 г. Гэта вядомы ў краіне навуковы цэнтр. Шырокі дыяпазон даследаванняў дае калектыву магчымасць працаваць на ўзроўні высокіх сучасных запатрабаванняў.

Нездарма калектыў інстытута чатыры разы быў узнагароджаны Пераходным Чырвоным Сцягам былога Міністэрства вышэйшай і сярэдне-спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў вышэйшай школы. Але самае адметнае ўсё ж тое, што ў інстытуце выхаваўся малады і вельмі таленавіты калектыў вучоных. У пачатку дзейнасці інстытута ва ўсіх яго лабараторыях было не больш 40 кандыдатаў навук, а цяпер іх 160, вядучыя падраздзяленні інстытута ўзначальваюць доктары навук. Сучасным запатрабаванням развіцця навукі адпавядае таксама матэрыяльная база.

Зразумела, што ва ўсім гэтым немалая заслуга і дырэктара інстытута А. Ф. Чарняўскага. Сам ён як вучоны і арганізатар, вырас ва універсітэце. Гэты рост вельмі дынамічны і павучальны, асабліва для тых, хто ідзе ў навуку.

У 1985 годзе аспірант А. Ф. Чарняўскі абараніў кандыдацкую, а ў 1971 — доктарскую дысертацыі. Гэта можна растлумачыць тым, што, пачынаючы са студэнцтва, Аляксандр Фёдаравіч працаваў напорыста, упарта дабіваўся пастаўленай мэты.

Вось яшчэ адна адметная акалічнасць. А. Ф. Чарняўскі трапіў у шчаслівую паласу развіцця фізічнай навукі ва універсітэце. У канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў ва універсітэце склалася надзвычай творчая абстаноўка. Пераадолеўшы ваеннае разарэнне, калектыў універсітэта набіраў сілу. Студэнтамі стала пакаленне маладых людзей, якія праглі новых дасягненняў у розных напрамках навукі. Таму сярод юнакоў і дзяўчат хутка вылучаліся асабліва таленавітыя, якія зараз складаюць аснову універсітэцкай і акадэмічнай навукі.

У той час пачыналі свой шлях прафесары Л. І. Камароў, А. М. Саржэўскі, В. Д. Ткачоў, Д. С. Умрэйка, С. С.



Шушкевіч і іншыя. Словам, было на каго раўняцца і з каго браць прыклад. Асабліва ўплыў аказваў на маладых фізікаў крыху старэйшы іх таварыш, у хуткім часе прарэктар па навуковай рабоце універсітэта, акадэмік Л. В. Валадзько.

Былі і добрыя настаўнікі. Сярод іх — рэктар універсітэта, акадэмік А. А. Сеўчанка. Побач з гэтымі людзьмі складвалася творчая біяграфія прафесара А. Ф. Чарняўскага.

Цяпер яе вехі адзначаны прэміяй Савета Міністраў СССР, Дзяржаўнай прэміяй БССР, медалямі ВДНГ СССР. Зразумела, не ўзнагароды, а вынікі працы ў першую чаргу складаюць аўтарытэт дырэктара. Аляксандр Фёдаравіч стварыў сваю навуковую школу, з якой выйшлі 28 кандыдатаў і два доктары навук. Ён — аўтар пяці манаграфій, многіх артыкулаў па сучасных праблемах фізікі ў айчынных і замежных выданнях, мае аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы, неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных сімпозіумах і канферэнцыях.

Навуковыя дасягненні, жыццёвы вопыт складаюць трывалую аснову ў выпрацоўцы стылю кіраўніцтва інстытутам. Дырэктар імкнецца нацэльваць калектыў на распрацоўку самых сучасных, дзяржаўна важных навуковых праблем. У вырашэнні гэтай задачы ўзяты правільны кірунак: сістэмы, зробленыя ў лабараторыях інстытута, павінны хутка ўкараняцца ў вытворчасць. Якраз на гэтым узроўні ўкаранення распрацовак у жыццё дырэктара і калектыў інстытута спасцігае шмат цяжкасцей. Эксперыментальная база амаль адсутнічае, канструктарскае бюро даволі слабае і абслугоўвае ўвесь універсітэт. Таму даводзіцца наладжваць сваю канструктарскую службу і ствараць канструктарскае бюро спецыяльнай тэхнікі.

Мэтанакіраванасць на вышэйшыя дасягненні ў навуцы дыктуе напружанасць у працы, стыль скрупулёзнага адбору людзей, якія папаўняюць калектыў падраздзялення, праграміруе і адносіны калектыву з дырэкцыяй.

Прафесар А. Ф. Чарняўскі прыхільнік адкрытага дыялогу ў любых абставінах жыцця. Яго ацэнка дзейнасці калектыву лабараторыі, асобных супрацоўнікаў ідзе па шкале канкрэтных дзеянняў і вынікаў, укладу ў агульную справу. Гэта стварае ў калектыве дзелавы настрой, што, у сваю чаргу, дазваляе інстытуту дабівацца высокіх вынікаў.

Важным фактарам узорнай працы інстытута з'яўляецца тонкае разуменне прафесарам А. Ф. Чарняўскім дынамікі развіцця сучаснай навукі. Ён захапляе супрацоўнікаў навізной праблем, выхоўвае своеасаблівую псіхалогію абвостранай зацікаўленасці працай. Гэта спалучаецца з энергіяй і талентам маладых вучоных, якія ў інстытуце пастаўлены на грань вынаходніцтваў і адкрыццяў. І зусім не выпадкова, што яны (як у гэтым годзе П. В. Комар і С. Г. Сіняковіч) за свае выдатныя працы атрымліваюць прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Увогуле прафесар А. Ф. Чарняўскі канструктыўна ставіцца да праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў. Ён лічыць, што для таго, каб менш было браку, патрэбна яшчэ да дыплома так «абкатаць» студэнта, каб потым пазбавіць яго доўгага «ўваходжання» ў ролю на працоўным месцы. А. Ф. Чарняўскі, дарэчы, адзін з аўтараў і распрацоўшчыкаў аўтаматызаваных навучальных сістэм на базе ЭВМ, якія выкарыстоўваюцца ва універсітэце і іншых ВНУ краіны. Акрамя таго, матэрыяльны патэнцыял інстытута з'яўляецца самай лепшай базай для практыкі студэнтаў, хаця гэта праблема вырашаецца станоўча.

Калі ідзе размова пра знакамітага чалавека, часта здараецца, што вялікая працоўная і грамадская дзейнасць засланяюць сабой шматграннасць яго асобы. Тады цяжка заўважыць супярэчлівасць характару, своеасаблівыя рысы, якія даюць чалавеку маральнае права кіраваць калектывам.

Прафесар А. Ф. Чарняўскі — асоба складаная. Ён настойлівы, упарты і нават жорсткі. Напэўна, не ўсім да спадобы такі характар. У той жа час ён пазбаўлены паспешлівасці ў сваіх дзеяннях, асабліва, калі справа датычыць людзей або канкрэтнага чалавека. Ён лічыць, што любую праблему, складаную сітуацыю патрэбна вырашаць спакойна, канструктыўна і без правалочак. Гэта сучасны стыль кіраўніцтва, які прымае і разумее большая частка людзей.

Інакш кажучы, ад людзей, падобных на прафесара А. Ф. Чарняўскага, у значнай меры залежыць поспех у абнаўленні ўсіх бакоў жыцця нашага грамадства.

А. СЛУКА,
дэкан факультэта журналістыкі.
Фота С. ГРЫЦА.

## З КАМПЕТЭНТНЫХ КРЫНІЦ

# Адрасаты Фонду міру

***Часта ў рэдакцыйнай пошце можна сустрэць пісьмы, аўтары якіх цікавяцца, куды ідуць грошы, што паступаюць у Фонд міру. Прапануем вам кампетэнтны каментарый Беларускага аддзялення Савецкага фонду міру.***

У першым паўгоддзі гэтага года ў Савецкі фонд міру паступіла каля 123,1 млн. рублёў. Усе гэтыя сродкі расходаваліся ў адпаведнасці са Статутам і пажаданнямі ўкладчыкаў.

Фонд фінансіруе дзейнасць 17 грамадскіх арганізацый, якія дзейнічаюць у імя міру і раззбраення (Савецкі камітэт абароны міру, Савецкі камітэт ветэранаў вайны, Камітэт савецкіх жанчын, Асацыяцыя садзеяння ААН у СССР, Савецкі камітэт салідарнасці краін Азіі і Афрыкі, Савецкі камітэт за еўрапейскую небяспеку і супрацоўніцтва, Камітэт савецкіх вучоных у абарону міру, супраць ядзернай пагрозы і г. д.). Іх дзейнасць шырока вядома ў нашай краіне.

На развіццё міжнародных сувязей і кантактаў, правядзенне кангрэсаў, канферэнцый, семінараў, арганізацыю маршаў, паходаў і круізаў міру, іншых антываенных мерапрыемстваў за першую чвэрць года патрачана 14,1 млн. рублёў (уключаючы 3,5 млн. руб., выдзеленых Міжнароднаму фонду за выжыванне і развіццё чалавецтва).

Значная частка сродкаў ідзе на выдавецкую і інфармацыйна-прапагандысцкую дзейнасць, выпуск кніг і брашур па праблемах міру і раззбраення, вытворчасць кінафільмаў на антываенную тэматыку (напрыклад, фільм «Стэрэатыпы») і інш.

Па пажаданню ўкладчыкаў і выказваючы пачуццё інтэрнацыяналізму і гуманізму савецкіх людзей, Фонд міру аказваў матэрыяльную дапамогу ахвярам войн і агрэсій, насельніцтву краін, дзе адбыліся стыхійныя бедствы. На аказанне дапамогі народам Афганістана, Эфіопіі, В'етнама, Мазамбіка, Кубы і іншых краін, нацыянальна-вызваленчаму руху Поўдня Афрыкі, палесцінскаму насельніцтву на акупіраваных Ізраілем арабскіх тэрыторыях выдзелена каля 8 млн. рублёў.

Кардынальны паварот Фонду міру да сацыяльных і маральных праблем савецкага грамадства — гэта таксама ўклад ва ўмацаванне міру, даверу і дружбы паміж народамі. У першым паўгоддзі 1988 года на гэтыя мэты было выдзелена:

— 12 млн. руб.— на будаўніцтва ў г. Алма-Аце шпіталя для ветэранаў вайны і воінаў-інтэрнацыяналістаў;

— 20 млн. руб. — на стварэнне двух Цэнтраў медыка-сацыяльнай рэабілітацыі для воінаў-інтэрнацыяналістаў (ва Узбекскай ССР і Краснадарскім краі);

— 30 млн. руб.— на стварэнне новых аддзяленняў сацыяльнай дапамогі дома, на пашырэнне патранажнай службы для аказання медыка-сацыяльнай дапамогі інвалідам вайны, адзінокім, састрэлым і непрацаздольным бацькам і ўдовам ваеннаслужачых, што загінулі пры абароне Радзімы. З гэтай сумы 5 млн. руб. выдзелена на павелічэнне ўдвая колькасці патранажных сясцёр, міласэрная дапамога якіх так неабходна «салдацкім удовам», інвалідам і ветэранам вайны;

— 3 млн. руб.— на будаўніцтва і абсталяванне навейшай медыцынскай апаратурай спецыялізаванага корпуса ў г. Ленінградзе для тых, хто перанёс блакаду;

— 400 тыс. руб.— на набыццё абсталявання для шпіталяў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў Марыйскай і Магаданскай абласцях;

— 51 тыс. руб.— для набыцця і ўручэння да Дня Перамогі каляровых тэлевізараў для 72 шпіталяў для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны;

— 326 тыс. руб.— на ўзвядзенне помнікаў ахвярам фашызму ў Бранскай і Сумской абласцях і Эстонскай ССР;

— 400 тыс. руб.— на будаўніцтва школы і дзіцячага сада ў раёне, які быў разбураны выбухам на чыгуначнай станцыі Арзамаса.

Гэта асноўныя адрасаты расходавання сродкаў Фонду міру. Агульная сума іх прыкладна дасягае 90 млн. руб.

Трэба дадаць, што на ўтрыманне штатнага апарату з добраахвотных сродкаў Савецкага фонду міру зараз не трацiцца ніводнага рубля: неабходныя для гэтага грошы атрыманы ад уласнай фінансавай і эканамічнай дзейнасці Праўлення Фонду міру.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона» зорка» МВПА імя Я. Коласа.
20 кастрычніка
Зак. 1633.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.